**А. М. Кушнярэвіч**

# ГЕРМАНСКІ КАМПАНЕНТ РАННЯЙ ЭТНІЧНАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Вывучэнне этнічнай гісторыі таго альбо іншага народа, пытанні міжэтнічных кантактаў, узаемаадносін, узаемаўплываў былі і застаюцца актуальнымі праблемамі сучаснай этнакультуралогіі. Таму мэта публікацыі – на аснове

вынікаў археалагічных даследаванняў ахарактарызаваць змены ў культуры Беларусі часоў рассялення на яе тэрыторыі готаў у рамках распрацоўкі аднаго з раздзелаў індывідуальнай навуковай тэмы, прысвечанай германа-беларускім этнакультурным кантактам ад старажытнасці да Навейшага часу ва ўсёй іх разнастайнасці.

Этнакультурныя стасункі паміж германцамі і этнічнымі супольнасцямі Беларусі вядомы са старажытных часоў і ўзыходзяць да апошніх этапаў першабытнасці. Тады ў час перасялення з розных рэгіёнаў паўднёвай Скандынавіі аднаго з германскіх плямёнаў – готаў – у Паўночнае Прычарнамор'е на тэрыторыі паўночна-усходняй Польшы, паўночна-заходняй Украіны і паўднёва-заходняй Беларусі ў апошняй чвэрці II ст. н.э. распаўсюдзілася вельбарская археалагічная культура жалезнага веку, насельніцтва якой атаясамліваецца з народамі, што ўваходзілі ў згаданы ўсходнегерманскі племянны саюз. Яе назва паходзіць ад аднаго з першых шырока даследаваных могільнікаў каля мястэчка Вельбарк у Ніжнім Павісленні. Спачатку яе помнікі аб'ядноўвалі пад назвай венедскай ці гота-гепідскай культуры. На тэрыторыі Беларусі і Украіны яе помнікі часам называюць помнікамі тыпу Брэст – Трышын – Дытынічы. Усе даследчыкі адзначаюць поліэтнічны характар вельбарскай культуры. Побач з готамі, якія сталі галоўным этнічным кампанентам культуры, у яе склад уваходзілі гепіды, вандалы, бургунды і іншыя германскія плямёны. На ўсходзе гэта культура не распаўсюдзілася далей ракі Гарынь. На тэрыторыі паўднёва-заходняй Беларусі адкрыты звыш дзесяці помнікаў і месцазнаходжанняў вельбарскай культуры. Яны размешчаны на берагах рэк Заходні Буг, Лясная, Мухавец, Прыпяць, Ясельда, Гарынь [1, с. 298–299]. Найбольш даследаваным помнікам вельбарскай культуры на Беларусі з'яўляецца могільнік Брэст – Трышын на р. Мухавец. Помнікі вельбарскай культуры на яе тэрыторыі датуюць II–IV ст.: Вялічкавічы (Камянецкі р-н), Велямічы (Столінскі р-н), Брэст – Трышын і Дружба (Брэсцкі р-н) і інш. Таму арэл распаўсюджвання вельбарскай культуры ў Беларусі абмяжоўваецца толькі рэгіёнамі Палесся – брэсцкім Пабужжам і Цэнтральным (Пінска-Тураўскім) Палессем. З гэтай культурай можна звязаць таксама асобныя знаходкі, выяўленыя ў Верхнім Панямонні [2]. У цэнтральным Палессі помнікі вельбарскай культуры лакалізаваны пераважна ў міжрэччы правых прытокаў Прыпяці – Стыры і Гарыні. Найбольш рэпрэзентатыўныя яе матэрыялы вядомы па даследаваннях на Пабужжы. Тут арэал рассялення носьбітаў вельбарскай культуры ахопліваў цячэнне Заходняга Буга і ніжнюю частку яго правых прытокаў – Мухаўца, Лясной і Пульвы. Матэрыялы вельбарскай культуры на беларускім Пабужжы паходзяць з помнікаў рознай ступені даследаванасці. Выключнае становішча сярод іх займае могільнік у Брэсце – Трышыне, які з'уляецца адным з эталонных для тэрыторыі Усходняй Еўропы помнікаў вельбарскай культуры [3, s. 300]. З помнікамі вельбарскай культуры на тэрыторыі Брэсцкага Пабужжа і Верхняга Панямоння сёння можна звязаць 8 помнікаў і месцазнаходжанняў (Збунін, Скорбічы, з 1964 г. в. Дружба, Брэст – Трышын – Брэсцкі раён; Ратайчыцы, Вялічкавічы Камянецкі раён; Пятровічы – Жабінкаўскі раён). Аб помніках

вельбарскай культуры з тэрыторыі беларускага Цэнтральнага Палесся сёння можна скласці толькі самае папярэдняе ўяўленне. Арэал распаўсюджвання гэтай групы помнікаў вызначаюць асобныя знаходкі і комплексы, размешчаныя ад Пінска на захадзе да Тураўшчыны на усходзе і ад верхніх прытокаў Прыпяці на поўначы да верхняга цячэння Гарыні на поўдні [3, s. 330]. Найбольш прадстаўнічыя матэрыялы вельбарскай культуры тут былі атрыманы ў час даследаванняў на грунтовых могільніках зарубінецкай культуры (Велямічы, Атвержычы – Столінскі р-н, Лемяшэвічы – Пінскі раён) [Там жа, s. 332]. У наш час немагчыма адназначна сказаць, як далёка прасунулася насельніцтва вельбарскай культуры ў каланізацыі Заходняга Палесся і ці ўтваралі тут «готскія» пасялені суцэльны этнічны масіў ад Пабужжа да Тураўшчыны. Невядома таксама, адкуль мог накіравацца міграцыйны паток насельніцтва вельбарскай культуры, якое засяліла частку беларускага Цэнтральнага Палесся з тэрыторыі брэсцкага Пабужжа па Прыпяці, з Панароў'я ўніз па Ясельдзе, праз Валынь па правых прытоках Прыпяці, ці з розных рэгіёнаў і ў розныя часы. Аднак пры гэтым вынікі археалагічных даследаванняў сведчаць, што ў познерымскі перыяд гэта група пасяленцаў усталявала цесныя і стабільныя сувязі з роднасным насельніцтвам Заходняй Валыні. Падобна на тое, што на развітым і познім этапах познерымскага перыяду «готы» Пінска-Тураўскага Палесся з'яўляліся акраінай, паўночнай часткай валынскага этнакультурнага масіву [2, с. 334; 4, 449]. Адметнасць вельбарскай культуры на фоне іншых культур цэнтральнай і усходняй Еўропы найбольш ярка праяўляецца ў пахавальным абрадзе, якому ўласцівы дзве традыцыі: монарытуальныя па абраду крэмацыі (Брэст – Трышын) і бірытуальныя пахаванні (Пятровічы, Велямічы, Скорбічы) [5, с. 187; 6, с. 8–9]. На Беларусі выяўлены толькі безкурганныя могільнікі вельбарскай культуры. Рэшткі надмагільных канструкцый не прасочваюцца. У Пабужжы могільнікі культуры лакалізуюцца на пясчаных узвышэннях рачных тэрас на адлегласці ад 0,3 да 1,5 км, звычайна на тых жа берагах рэк, што і звязаныя з імі пасяленні. Апошнія размяшчаюцца на высокіх участках рачных тэрас, часта ў месцах упадзення ў рэкі іх невялікіх прытокаў ці ручаёў. Ва ўсім арэале культуры яе носьбіты жылі ў неўмацаваных пасяленнях. Найбольш характэрным тыпам пабудоў з'яўляюцца двухкамерныя (жылая і гаспадарчая частка) наземнае жыллё слупавой канструкцыі, так званыя доўгія дамы, плошчай каля 80–100 м$^2$. Былі пашыраны таксама зямлянкі слупавой канструцыі і гаспадарчыя пабудовы плошчай каля 16–25 м$^2$. Аснову гападаркі вельбарцаў складала ворыўнае земляробства і металургія. Сярод зернавых культур перавагу аддавалі аўсу, ячменю, просу, пшаніцы, жыту, вядомым яшчэ ў І–ІІ ст. У час жатвы выкарыстоўвалі сярпы і косы. Зерне малолі з дапамогай ручных жорнаў. Займаліся развядзеннем авечак, коз, з поўсці якіх выраблялі тканіну. Гандаль таксама займаў значнае месца ў гаспадарчай дзейнасці. Насельніцтва культуры кантралявала ключавыя ўчасткі «янтарнага» і балтыйска-чарнаморскіх гандлёвых шляхоў, якія звязвалі народы балтыйскіх рэгіёнаў з Рымскай імперыяй. Для вельбарскай культуры на Беларусі, як і на іншай тэрыторыі яе распаўсюджвання, характэрны ў асноўным ляпны посуд. Толькі зрэдку знаходзілі ганчарныя

сасуды [3, s. 300]. Посуд (як важны элемент матэрыяльнай культуры вельбарцаў) – дастаткова разнастайны: гаршкі, збаны, вазы, конаўкі, міскі. Значная колькасць посуду ўпрыгожана разнастайным арнаментам у выглядзе кругавых ліній, насечак, наколаў, пазногцявых уцісканняў, расчосаў, якія нярэдка ўтвараюць складаныя камбінацыі. Керамічны комлекс дапаўняюць гліняныя праслiцы. Найбольш пашыраны біканічныя праслiцы, частка з іх упрыгожана кропкавым арнаментам або вертыкальнымі ці касымі баразёнамі [Там жа, s. 303]. Акрамя керамічных вырабаў, на тэрыторыі на помніках вельбарскай культуры Беларусі знойдзены побытавыя рэчы і прылады працы. Часцей за ўсё сустракаюцца касцяныя грабяні, а таксама касцяныя шпількі, бронзавыя іголкі, фрагмент брытвы, часткі жалезных замкоў, фрагменты шклянога посуду. Часта сустракаюцца ўпрыгажэнні (бранзалеты, падвескі, пацеркі), прадметы аздобы касцюмаў (фібулы, паясныя спражкі, наканечнікі папругі) [1, с. 300–303].

У другой палове II–IV ст. групы вельбарскіх пасяленцаў у Турава-Пінскім Палессі ўтваралі культурнае адзінства з насельніцтвам заходняй Валыні і носьбітамі вельбарскай культуры, якія жылі на правабярэжжы сярэдняй Віслы ў Мазовіі і Падляшшы. У канцы IV ст. у сувязі з нашэсцем гунаў, зруйнаваўшых протадзяржаўныя сацыяльна-палітычныя ўтварэнні готаў у Паўночным Прычарнамор'і, помнікі вельбарскай культуры, якіх налічваецца больш за дваццаць у Беларусі, як і на большай частцы арэала гэтай культуры, спыняюць існаванне [2, с. 156]. Аднак сляды вельбарскага насельніцтва захаваліся не толькі ў выглядзе археалагічных помнікаў, але і ў назве этнасу на беларускай зямлі. Так, жыхары Панёмання, размешчанага паўночней брэсцка-пінскага Палесся, берасцейцаў-пінчукоў, валынян і значную частку палешукоў называлі этнонімам *гідуны*, які бытаваў і сярод мясцовага насельніцтва разглядаемага рэгіёна [7, с. 43–44; 8]. На думку даследчыкаў, першапачатковае літоўскае *гуды* таксама адпавядае сярэднявечнаму этноніму *готы*, які выцякае ад лацінскага *Gothi*. Сябе ж яны называлі эндоэтнонімам *Gutans*, *Gutos*, ад якога, напэўна, паходзіць этнонім *гуды*. Для старажытных жа балцкіх плямёнаў готы былі паўднёвамі суседзямі. Таму падобна на тое, што літоўцы паўторна перанеслі назву готаў на іншыя плямёны з поўдня – славян [9, с. 268–269]. Старажытныя гуды пакінулі сляды ў назвах многіх пасяленняў, якія сустракаюцца галоўным чынам ў басейне верхняга Нёмана і яго правых прытокаў. Да апошняга часу захаваліся шматлікія назвы населеных пунктаў з корнем *гуд*: *Гуды* ў Лідскім і Валожынскім раёнах, *Гудзені* ў Воранаўскім і Стаўбцоўскім раёнах *Гудагай*, *Гудовічі*, *Гудалішкі* ў Астравецкім і другіх раёнах. У беларускай мове захавалася шмат запазычванняў з готскай мовы, найперш звязаных з хатняй гаспадаркай: *hlevu* 'хлеў', *hlebu* 'хлеб', *bljuo* 'блюда', *kotilu* 'медны кацялок'. Сустракаюцца эканамічныя тэрміны: *dulgu* 'доўг', *lihva* 'прыбытак' і асобныя ваенныя тэрміны: *meci* 'меч', *helm* 'шлем' [10, с. 267–268].

Такім чынам, вельбарская культура, галоўную ролю ў фарміраванні якой адыгралі готы, існавала на тэрыторыі паўднёва-заходняй Беларусі ў апошняй чвэрці II–IV ст. Сляды вельбарскага насельніцтва захаваліся ў этнаніміі і тапаніміцы Заходняй Беларусі, а таксама яе матэрыяльнай культуры згаданага часу.

У беларускай мове атрымалі распаўсюджванне самыя раннія запазычванні германізмаў з готскай мовы. Іх этымалогія дазваляе глыбей зразумець гісторыю і накірункі германа-беларускіх этнакультурных кантактаў ранняга часу.

ЛІТАРАТУРА


1. *Вяргей, В. С.* Помнікі вельбарскай культуры / В. С. Вяргей // Археалогія Беларусі : у 4 т. / А. А. Егарэйчанка [і інш.] ; пад. рэд. В. І. Шадыры, В. С. Вяргей. – Мінск, 1999. – Т. 2 : Жалезны век і ранняе сярэднявечча. – С. 298–317.

2. *Белявец, В. Г.* Помнікі вельбарскай культуры ў Турава-Пінскім Палессі: праблемы вывучэння / В. Г. Белявец // Гісторыка-археалагічны зборнік / гал. рэд. А. А. Каваленя. – Мінск, 2008. – Вып. 22. – С. 154–156.

3. *Белявец, В. Г.* К изучению памятников вельбарской культуры в Беларуси / В. Г. Белявец // Nowe materyały i interpretacje : stan dyskusji na temat kultury wielbarskiej / Muzeum Archeol. w Gdańsku ; pod. red. M. Fudzińskiego, H. Panera. – Gdańsk, 2007 – S. 293–344.

4. *Белявец, В. Г.* Насельніцтва вельбарскай культуры ў гісторыка-культурным развіцці зямель Беларусі рубяжу II/III – пачатку V ст. / В. Г. Белявец // Славяне на территории Беларуси в догосударственный период : к 90-летию со дня рождения Л. Д. Поболя : в 2 кн. / О. Н. Левко [и др.] ; науч. ред.: О. Н. Левко, В. Г. Белевец. – Минск, 2016. – Кн. 1. – С. 384–450

5. *Русанова, И. П.* Вельбарская культура / И. П. Русанова // Археология СССР. Славяне и их соседи в конце I тысячелетия до н.э. – первой половине I тысячелетия н.э. : сб. науч. ст. под ред. Б. А. Рыбакова. – М., 1993. – С. 183–191.

6. *Вяргей, В. С.* Усходнія германцы на Беларусі ў 2-ой чвэрці I тысячагоддзя н.э. / В. С. Вяргей // Гісторыя Беларусі. Жалезны век і сярэднявечча. Да 70-годдзя з дня нараджэння Г. В. Штыхава : зб. навук. арт. / пад рэд. М. П. Касцюка ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 1997. – С. 7–10.

7. *Клімчук, Ф.* Заходнепалескі этнонім гідуны / Ф. Клімчук // Беларусь у сістэме трансеўрапейскіх сувязей I тыс. н.э. : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 9–10 каст. 1996 г. ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі / рэдкал.: М. П. Касцюк [і інш.]. – Мінск, 1996. – С. 43–45.

8. *Климчук, Ф.* Этническая структура населения Брестской области (к вопросу о «скрытых» этносах) [Электронны рэсурс] / Ф. Климчук. – Рэжым доступу : http://brama.brest.by/nomer12-13/artic03.shtm. – Дата доступу : 24.04.2020.

9. *Дзярновіч, А.* «Гуды» як гістарычны назоў беларусаў па літоўску: «готы» ці варвары / А. Дзярновіч // Беларусь і беларусы сярод суседзяў: гістарычныя стэрэатыпы і палітычныя канструкты : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Варшава, 9–10 снеж. 2011 г. – Варшава, 2013. – С. 267–273.

10. *Тугай, В. В.* Гуды в истории Беларуси / В. В. Тугай, С. П. Кубека // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 14 крас. 2017 г. / рэдкал. : А. А. Каваленя (адк. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2018. – Вып. 16. – С. 267–272.